■ Грашовы калькулятар

СВАБОДНЫЯ ГРОШЫ ПАВІННЫ «ПРАЦАВАЦЬ»...

Разважанні з калькулятарам у руках паказваюць, што зберажэнні сёння прымнажаць лепш у айчыннай валюце

На мінулым тыдні кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ аб правядзенні налета ў ліпені ў нашай краіне дэнамінацыі грашовай адзінкі маштабам 1 да 10 тысяч. Для людзей, абазнаных у фінансах, гэта навіна не стала нейкай нечаканасцю, бо абслугоўванне грашовай масы з такой колькасцю нулёў сапраўды ўскладняе функцыянаванне айчыннага фінансавага рынку. Дэнамінацыя наспела, а гаворка аб яе правядзенні вялася на розных узроўнях ужо не першы год, аднак...

АЖЫЯТАЖУ НЕ БУДЗЕ

Усё новае выклікае пэўную асцярогу. Напрыклад, на выхадных мне патэлефанавалі адразу тры сябры, якія чакалі парад наконт выкарыстання свабодных зберажэнняў. Ці мэтазгодна сёння ісці ў банк па замежную валюту, або, наадварот, «скідваць» долары, бо налета нацвалюта стане сапраўды стабільнай? Бегчы ў абменнік я б не параіў у любым выпадку, бо прымаць сур'ёзныя рашэнні трэба з халоднай галавой, а не пад уплывам нейкіх эмоцый. Адзінае, што я б параіў, — трымаць свабодныя грошы трэба абавязкова на рахунку або ў каштоўных паперах у банку, бо менавіта там яны не проста захоўваюцца, але і прыносяць даход. У сваіх далейшых падліках мы паспрабуем разабрацца ва ўзроўнях даходаў па розных схемах фінансавых укладанняў.

Бегчы ў абменнік я б не параіў у любым выпадку, бо прымаць сур'ёзныя рашэнні трэба з халоднай галавой, а не пад уплывам нейкіх эмоцый.

Тут адразу заўважу, што Нацбанк не чакае ажыятажнага попыту на валюту ў сувязі з дэнамінацыяй. **Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый ЛАПКО** адзначыў: «Па-першае, мы дзейнічаем адкрыта і загадзя, мы аб'яўляем аб запланаваных дзеяннях за 8 месяцаў да іх старту. Усе павінны выдатна разумець, што дэнамінацыя — гэта чыста тэхнічнае мерапрыемства і ніяк не будзе ўплываць ні на даходы, ні на цэны». Са свайго боку, начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў — **прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Аляксандр ЦІМАШЭНКА** заўважыў: сёння Нацбанк зацікаўлены ў тым, «каб працэс дэнамінацыі праходзіў максімальна адкрыта і празрыста».

5% У ВАЛЮЦЕ — ЯШЧЭ НЕ ФАКТ

Сваё даследаванне пачнем з валютных укладаў. Паспрабуем адшукаць адразу максімальную працэнтную стаўку па валютным дэпазіце ў камерцыйных банках. Яна складае да 5,5% гадавых. Такая сур'ёзная стаўка прапануецца па дэпазітах з вялікім тэрмінам захоўвання (ад 18 месяцаў да 3 гадоў), аднак існуе шэраг мінусаў. Справа ў тым, што такая стаўка з'яўляецца ў банка плаваючай, бо ўжо праз месяц яна можа быць зменена (паменшана) у аднабаковым парадку на сур'ёзную велічыню. Кліент можа не згадзіцца з гэтым і паспрабаваць зняць уклад датэрмінова. Аднак у гэтым выпадку банкі звычайна прадугледжваюць зніжаную працэнтную стаўку, якая можа дасягаць усяго 0,5-1% гадавых.

Каб не разгубіцца ў нюансах гэтых працэнтаў, спецыялісты раяць звяртаць увагу на памер эфектыўнай працэнтнай стаўкі і непасрэдна ўдакладняць у банках умовы штрафных санкцый пры датэрміновым зняцці ўкладаў. Дарэчы, максімальны памер гэтай самай эфектыўнай стаўкі ў большасці камбанкаў сёння не бывае большым за 4,8% гадавых.

Што тычыцца найбуйнейшых дзяржаўных банкаў, то тут даходнасць валютных дэпазітаў на маленькія тэрміны захоўвання (да года) увогуле складае ад 2,5 да 4%. Ёсць у нашых банкаўскіх гігантаў і больш прывабныя дэпазіты — на кароткія тэрміны, але і па іх прапануюцца нефіксаваныя працэнтныя стаўкі.

Выключэннем цяпер могуць стаць дакументарныя валютныя аблігацыі на прад'яўніка. Да апошняга часу (яшчэ ў пачатку года) падобныя каштоўныя паперы мелі даходнасць 6,5% гадавых, пры тэрміне абарачэння 1,5 года. Сёння такіх прывабных умоў па аблігацыях ужо не існуе, а прапануюцца каштоўныя паперы з даходнасцю 5,5% гадавых. Мінімальны кошт такіх аблігацый складае тысячу долараў, а працэнты выплочваюцца праз 6 месяцаў.

РУБЛЁВЫ ДЭПАЗІТ — ДА 30%

Па беларускіх рублях выбар у кліентаў значна большы. Усе невялікія камерцыйныя банкі прапануюць звычайна высокія працэнты (да 30%) у тым выпадку, калі ўклад адкрываецца на невялікі тэрмін (30-35 дзён), або пры ўмове плаваючай стаўкі. У гэтым выпадку рэальная стаўка можа быць паменшана ўжо на наступны месяц, ці праз два. Можна адшукаць уклад і на 35-60 дзён, за якія ўладальнік дэпазіту атрымае стабільныя 26%. Пры пралангацыі падобных укладаў працэнтная стаўка звычайна зніжаецца.

А вось фіксаваны даход традыцыйна прапануюць самыя буйныя банкі краіны, але і даходнасць там крыху меншая. Звычайна такая даходнасць прывязана да стаўкі рэфінансавання Нацбанка, якая сёння складае 25%. Тэрмін захоўвання падобных укладаў можа вагацца ад 3 месяцаў да 2 гадоў. «Прасунутым» карыстальнікам глабальным сецівам фінансісты часам робяць даволі нядрэнныя прапановы, дзе даходнасць крыху большая.

Прапануюцца каштоўныя паперы з даходнасцю 5,5% гадавых. Мінімальны кошт такіх аблігацый складае тысячу долараў, а працэнты выплочваюцца праз 6 месяцаў.

Напрыклад, Беларусбанк прапануе тэрміновы банкаўскі ўклад, які адкрывае для кліентаў магчымасць кіравання ўласнымі зберажэннямі праз інтэрнэт з выкарыстаннем сваёй банкаўскай плацежнай карткі. Сярод пераваг падобнай прапановы будзе адкрыццё і кіраванне ўкладам без наведвання структурнага падраздзялення банка, а потым вяртанне ўкладу пры надыходзе тэрміну ажыццяўляецца шляхам пераводу рэшткаў грашовых сродкаў з налічанымі працэнтамі на банкаўскую картку. Па гэтай сістэме пры выкананні пэўных умоў прадугледжана налічэнне і прэміяльных працэнтаў, а агульны даход можа скласці да 27-30% гадавых. Па падобнай схеме банк дае большы даход кліенту, бо абслугоўванне такіх укладаў фінансавай установе абыходзіцца значна танней, чым пры звычайных дэпазітах.

Увогуле, сёння захаванне грашовых сродкаў менавіта ў нацыянальнай валюце на банкаўскіх рахунках робіцца больш выгадным, чым па лініі розных ашчадных механізмаў у замежнай валюце. Паводле прагнозаў спецыялістаў, наш рубель (у звязцы з расійскім) сёлета ўжо і так значна знізіў свае каціроўкі, таму надалей у яго бачыцца працяглая паласа стабільнай раўнавагі. Пэўным плюсам тут можа стаць і будучая дэнамінацыя ў ліпені наступнага года. Дадатковым фактарам захоўвання сваіх сродкаў у беларускіх рублях эксперты лічаць упэўненыя прагнозы Нацбанка аб утрыманні інфляцыі на 2016 год у межах 12%. Калі гэтыя прагнозы нашага фінансавага рэгулятара збольшага спраўдзяцца, то і курс замежнай валюты ў нас па наступным годзе павялічыцца не больш, чым на 10-12%. У гэтым выпадку рублёвыя дэпазіты стануць істотна больш выгаднымі за валютныя ўклады. Вось такая атрымліваецца грашовая арыфметыка на карысць айчыннай валюты... А канчатковае рашэнне, вядома, прымае кожны ўладальнік сваіх сродкаў самастойна.

ПАМЕР ДЭПАЗІТАЎ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

Спецыялісты аднаго вядомага камерцыйнага банка краіны склалі рэйтынг самых багатых гарадоў Беларусі. Багацце іх у рэйтынгу выстройвалася па сярэднім памеры дэпазіту. Найбольшую схільнасць да зберажэнняў прадэманстравалі жыхары Мінска, Наваполацка і Жлобіна, высветлілі эксперты на падставе маркетынгавага даследавання дынамікі дэпазітаў у 16 гарадах прысутнасці банка.

Самым багатым горадам Беларусі прадказальна аказаўся Мінск. Сярэдні памер дэпазіту ў сталіцы цяпер у 2 разы вышэйшы, чым у абласных цэнтрах. На другое месца выйшаў Наваполацк, які спецыялізуецца на нафтаперапрацоўцы, а трэці радок заняў горад металургаў — Жлобін. У першую пяцёрку таксама ўвайшлі Гродна і Магілёў, сярэдні памер дэпазіту ў якіх знаходзіцца прыкладна на адным узроўні.

Безумоўным лідарам па дынаміцы росту дэпазітаў у першым паўгоддзі стаў Гомель — у гэтым горадзе сярэдні памер дэпазіту вырас адразу ў 2 разы, што дазволіла яму пераскочыць у рэйтынгу з 13-й на 8-ю пазіцыю. Па такой жа прычыне на два радкі ўгору падняўся Наваполацк, дзе з пачатку года сярэдняя сума ўкладу вырасла ў 1,5 раза. Для параўнання, сярэдні памер дэпазіту ў Мінску павялічыўся на 19%. Разам з тым ёсць і гарады, жыхары якіх сталі адкладаць менш: напрыклад, у Жлобіне і Барысаве сярэдняя сума дэпазіту знізілася больш як на 10%.

«Прасунутым» карыстальнікам глабальным сецівам фінансісты часам робяць даволі нядрэнныя прапановы, дзе даходнасць крыху большая.

На сярэдні памер банкаўскага ўкладу ў тым ці іншым горадзе ўплывае мноства фактараў. Асноўны з іх — узровень заработнай платы адносна памеру бягучых выдаткаў. «Чым больш жыхары горада зарабляюць, тым больш адкладаюць і, адпаведна, давяраюць банкам свае сродкі ў выглядзе дэпазіту, — растлумачылі складальнікі рэйтынгу. — Напрыклад, у Мінску, дзе сярэдні ўзровень зарплаты вышэйшы за агульнарэспубліканскі, сярэдні памер дэпазіту прадказальна лідзіраваў са значным адрывам ад іншых гарадоў Беларусі. У канчатковым выніку багацце горада, выражанае праз сярэдні памер дэпазіту яго жыхароў, залежыць ад вытворчага патэнцыялу і дзелавой актыўнасці, якія непасрэдна адбіваюцца на прыбытках жыхароў і іх схільнасці да зберажэнняў».

У цэлым беларусы захоўваюць вернасць дэпазітам, паколькі лічаць іх найбольш надзейным спосабам прымнажэння асабістага капіталу. Вядома, што сёння даходнасць па ўкладах не такая высокая, якая была ў пачатку года, але банкі сталі прыцягваць жыхароў краіны не толькі працэнтнымі стаўкамі. Напрыклад, цяпер укладчык можа часткова здымаць грошы без страты працэнтаў, адкрыць дэпазіт пры дапамозе інтэрнэт-банка, свабодна папаўняць уклад і атрымаць у падарунак міжнародную картку.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

Антыкрызісны смартфон

Плюсы і мінусы ультрабюджэтнага «прасунутага» тэлефона

Шчыра кажучы, смартфон быў набыткам вымушаным. Неяк занесла ў леташнім маі ў камандзіроўку, адкуль трэба было тэрмінова адправіць матэрыял у нумар. І пасля таго, як тэкст быў набраны, пачалося самае цікавае: да бліжэйшага пункта з правадным інтэрнэтам адтуль было некалькі кіламетраў. Заставалася надзея на 3G-сувязь, але ж ніводзін мадэм упарта не хацеў лавіць сігнал. Разам з тым звычайны інтэрнэт-сігнал (2G) лавіўся добра, але ж паспрабуй перадаць што-небудзь з дапамогай просценькага тэлефона, на якім добра хіба што чытаць навіны...

«Хопіць гэта цярпець», — сказаў сабе і тут жа прыгадаў, што недзе ў горадзе бачыў рэкламу смартфона за 749 тысяч рублёў (тады — 73 долары ЗША), які прадаваўся па акцыі. Па характарыстыках ён быў не нашмат горшы за аналагі коштам у 1,5-3 млн рублёў.

Прайшло з тае пары амаль паўтара года. Наспеў час прааналізаваць слабыя месцы таннага кітайскага смартфона, якія пацягнулі дадатковыя выдаткі. Чэмпіёнства аддамо батарэі.

Першай батарэі для майго смартфона хапіла роўна на 7 месяцаў, пасля чаго яна ўздзьмулася. А цяпер самае галоўнае — знайсці новы фірменны акумулятар для смартфона аказалася задачай нялёгкай. На ўвесь Мінск адшукаў толькі адну майстэрню, якая мела акумулятары для тэлефона маёй маркі. Новая батарэя каштавала ўрэшце 320 тысяч рублёў. Са смартфонамі раскручаных сусветных марак прасцей: патрэбны акумулятар на іх можна набыць ледзь не ў кожным кіёску на рынку, не кажучы ўжо пра інтэрнэт-гандаль. Адпаведна, і «нажніцы» кошту дзякуючы розным прадаўцам шырэйшыя.

Наступным пунктам выдаткаў стаў шнур сілкавання. Зарадка ў смартфоне камбінаваная: кабель micro-USB падключаецца адным канцом да зараднай прылады, другім — да смартфона. Кабеля ў стандартнай пастаўцы хапіла на восем месяцаў, пасля чаго ён у адзін вечар перастаў працаваць. Новы шнур каштаваў на рынку «Ждановічы» 40 тысяч рублёў.

Топ-3 выдаткаў завяршае ахоўная плёнка, якая клеіцца на экран. Пры куплі смартфона прадавец папярэдзіў, што заводскай плёнкі хопіць прыкладна на 4 месяцы эксплуатацыі. Насамрэч яна ў мяне працягнула паўгода, пасля чаго пачала адклейвацца. Новая плёнка на тых жа «Жданіках» каштавала 40 тысяч рублёў. Неўзабаве будзе год, як яна выкарыстоўваецца.

Такім чынам, дадатковыя выдаткі на апаратную частку тэлефона склалі за год 400 тысяч рублёў. Плюсуем іх да першапачатковага цэнніка і атрымліваем лічбу ў 1 млн 149 тысяч рублёў. У прынцыпе, укладзеныя ў смартфон грошы мой «сотавік» адпрацаваў з лішкам. Той жа сэнсар і апаратнае начынне дагэтуль яшчэ не мяняліся.

Ёсць тут і іншы аспект — зручнасць. Зрэшты, калі вы жывяце ў вялікім горадзе і ў вас ёсць час, каб падскочыць на рынак па батарэю ці кабель, то рызыкнуць набыць танны апарат можна. А вось з малога горада ці наогул з вёскі не наездзішся па запчасткі...

«Ультрабюджэтнік» вызначаецца і больш сціплымі апаратнымі магчымасцямі ў параўнанні з больш дарагімі мадэлямі. Таму перад купляй лепш падумаць і скласці спіс функцый, якія будуць запатрабаваны карыстальнікам у смартфоне. Навошта ж выкладваць грошы, скажам, за вялікі аб'ём аператыўнай памяці, калі апарат патрэбен для таго, каб пачытаць навіны, паслухаць музыку і даведацца расклад транспарту?

Спакушае ва ультрабюджэтніку і год гарантыі. Разам з тым заяўлены тэрмін эксплуатацыі апарата — два гады. Але ж, паклаўшы руку на сэрца, запытаемся: ці шмат у каго сучасныя «прасунутыя» смартфоны працуюць значна больш за гэты тэрмін?

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by